# КРЫВІЯ

Выданьне беларускае дыяспары ў Чэхіі

№11 Верасень - Лістапад 2008

Культурна-асьветніцкая газэта

## ЗЬМЕСТ

**Беларуская Чэхія**
Дэманстрацыя ў падтрымку байкоту - ст. **1**
ФОРУМ 2000 - ст. **1 - 3**
Студэнцкая вечарына - ст. **3**
Вечар Славаміра Адамовіча - ст. **3**
Беларуская школа ў Празе - ст. **3**

**Навіны з Бацькаўшчыны**
Перамены ў Беларусі магчымыя толькі пасьля свабодных выбараў - ст. **4**
Артур Фінькевіч пакінуў “Малады Фронт“ - ст. **5**
Бясплатныя шэнгенскія візы ? - ст. **6**

**Пагляды, Разважаньні**
Пагляд Зянона - ст.**11**

**Спорт**
Рэкордная алімпіяда - ст.**7**
БАТЭ Барысаў у Лізе Чэмпіёнаў - ст.**8**
Рэаль - БАТЭ - ст.**8**
БАТЭ - Ювэнтус - ст.**9**
«Зэніт» — БАТЭ — 1:1

**Беларусы Эўразьвязу**
Яны захоўваюць беларускі дух - ст. **9**
Трагічна загінуў... - ст.**10**

**Новыя Кнігі, Прэса** - ст. **11**

**Разьвязка крыжаванкі** - ст.**11**

**Беларусь у Эўропе**
Эўрапэйскі Суд па правох чалавека - ст.**12**

**Рознае**
Віншаваньні - ст.**10, 12**
Падзяка - ст.**12**

## Беларуская Чэхія

### Дэманстрацыя ў падтрымку байкоту.

30 жніўня 2008 г. беларусы правялі ў цэнтры Прагі, на Старамесцкай плошчы, акцыю ў падтрымку байкоту “парлямэнцкіх выбараў“ у Беларусі. У акцыі прыняло ўдзел больш за 60 чалавек.

Апрача беларусаў у мерапрыемстве бралі ўдзел прадстаўнікі чэскай арганізацыі “Маладыя Кансэрватары“, грузінскай дыяспары, а таксама ўкраінцы. Сябры грамадзянскага згуртаваньня “Свабодная Беларусь,“ суполкі“Пагоня“ і моладзевага руху “Маладое Адраджэньне“ таксама падтрымалі грузінаў, якія пратэставалі супраць расійскай агрэсіі ў дачыненьні да Грузіі.



Беларускія актывісты раздалі мінаком каля тысячы лятучак з заявамі, у якіх высьсьняюцца прычыны байкоту незаконных “парлямэнцкіх выбараў“ у Беларусі ды асуджаецца расійская палітыка ў дачыненьні да Грузіі.

У сам дзень “выбараў“ у нядзелю 28-га верасьня беларусы правялі чарговую акцыю пратэсту - перад будынкам амбасады Рэспублікі Беларусь.

## Міжнародная Канфэрэнцыя ФОРУМ 2000 адбылася ў Празе 12 - 14 кастрычніка

Тэма сёлетняе сустрэчы: **“Паміж адкрытасьцю й фундамэнталізмам у 21 стагодзьдзі - традыцыя й сучаснасьць.“**

Форум 2000 пачаў сваю дзейнасьць у 1997 па ініцятыве былога чэскага прэзыдэнта Вацлава Гавэла.

Цяпер у Форуме бяруць удзел больш за 80 сусьветна вядомых палітыкаў, бізнэсоўцаў і дзеячоў культуры.

# Мілінкевіч выступіў на паседжаньні Форуму 2000

У дакладзе на пленарным паседжаньні Форуму 2000 лідэр Руху “За Свабоду” прадставіў сваё бачаньне дачыненьняў паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасьцю ў Беларусі. Ён падкрэсьліў, што цягам апошніх 15 год грамадзянская супольнасьць Беларусі знаходзіцца ў няроўным супрацьстаяньні з усеабдымнай бюракратычнай аўтарытарнай дзяржавай, якая выкарыстоўвае самыя розныя мэханізмы дзеля гарантаваньня неабмежанага панаваньня аднае палітычнае групоўкі.

Але, нягледзячы на ўсе высілкі ўладаў, у беларускай грамадзянскай супольнасьці ёсьць ма гутны грунт для далейшай пасьпяховай дзейнасьці.

“**Нашыя тры важнейшыя апірышчы – гэта вялікі дэмакратычны патэнцыял беларускага грамадзтва, моц нашых ідэяў і перакананьняў, унутраная ды міжнародная салідарнасьць.** Рэжыму вельмі добра вядома, што ў Беларусі вельмі шмат людзей, нездаволеных палітыкай сёньняшніх уладаў і якія хочуць зьменаў да лепшага. Менавіта таму, улады ня лічаць галасы беларусаў на выбарах”, - зазначыў Аляксандр Мілінкевіч.

У заключэньне свайго выступу Аляксандр Мілінкевіч распавёў пра магчымасьці дыялогу Эўропы зь Беларусьсю і заклікаў дэмакратычныя краіны праводзіць больш актыўную палітыку, каб паспрыяць рэалізацыі патэнцыялу дэмакратызацыі ды эўрапэізацыі беларускага грамадства.

**Крыніца:** Прэс-служба Руху “За Свабоду”
info@milinkevich.org

# Мілінкевіч праводзіў перамовы ў Празе

**По прылёце зь Менску ў Прагу 12 кастрычніка Аляксандр Мілінкевіч правёў перамовы зь міністрам замежных справаў Чэхіі Карэлам Шварцэнбэргам. Сустрэча адбывалася на праскім лётнішчы Ruzyně. Міністар Шварцэнбэрг накіроўваўся ў Люксэмбург на сустрэчу Рады міністраў Эўразьвязу, куды запрошаны міністар замежных справаў Беларусі Сяргей Мартынаў.**

Падчас перамоваў з К. Шварцэнбэргам лідэр Руху “За Свабоду” ахарактарызаваў сёньняшнюю сытуацыю ў Беларусі і выклаў сваю пазіцыю адносна дыялогу ЕЗ зь Беларусьсю. Ён пакрэсьліў важнасьць распрацоўкі дарожнай мапы паляпшэньня дачыненьняў ЕЗ-Беларусь, а таксама срогі і апэратыўны кантроль выкананьня ўмоваў дыялогу беларускім бокам.

“Чэхія – краіна, якая вельмі добра разумее выклікі, што стаяць перад Беларусьсю. Чэскі ўрад праводзіць пасьлядоўную палітыку падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасьці і заўсёды выступаў за правядзеньне маральнай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі. Са студзеня па ліпень 2009 году Чэхія будзе ажыцьцяўляць старшынства ў ЕЗ і нам вельмі важна падтрымліваць шчыльны кантакт з чэскімі партнёрамі”, падкрэсьліў Аляксандр Мілінкевіч.

Увечары 12 кастрычніка Аляксандр Мілінкевіч і старшыня Камітэту абароны рэпрэсаваных “Салідарнасьць” Іна Кулей узялі ўдзел ва ўрачыстым адкрыцьці Форуму 2000 і правялі перамовы з былым чэскім прэзыдэнтам Вацлавам Гавэлам.

У праграме візіту Аляксандра Мілінкевіча:

-- даклад на пленарным паседжаньні Форуму 2000 на тэму дачыненьняў між беларускай дзяржавай і грамадзянскай супольнасьцю,

--- удзел разам з Адамам Міхнікам у дыскусіі “Палітычная сцэна Беларусі ў 2008 годзе”,

-- сустрэча з прэм’ер-міністрам Чэхіі Мірэкам Тополянэкам,

-- перамовы ў чэскім Міністэрстве Замежных Справаў,

-- сустрэчы з прадстаўнікамі беларускай дыяспары і беларускімі студэнтамі, што навучаюцца ў Празе. У Іны Кулей запланаваныя сустрэчы з чэскімі праваабарончымі арганізацыямі і ініцыятывамі.

**Крыніца:** Прэс-служба Руху “За Свабоду”
info@milinkevich.org

# Палітычная сцэна Беларусі ў 2008 годзе

У гэтай дыскусіі бралі ўдзел сп. Аляксандр Мілінкевіч і сп. Адам Міхнік, уплывовы польскі журналіст і былы дысыдэнт, а сёньня галоўны рэдактар варшаўскай Газэты Выборчай.

Мадэратарам дыскусіі быў сп. Любош Вэсэлы, прадстаўнік чэскай Асацыяцыі Міжнародных Пытаньняў (АМО).

**Сп. Мілінкевіч** падаў грунтоўны аналіз сёньняшняй сытуацыі:

“Каб пазьбегнуць поўнай эканамічнай, а паступова й палітычнай залежнасьці ад Масквы, Лукашэнкаў рэжым прыйшоў да высновы, што трэба навязаць лепшыя сувязі з Эўразьвязам, хаця сам усё яшчэ спадзяецца, што Эўропа здаволіцца мінімальнымі, ‘касмэтычнымі’ адзнакамі лібэралізацыі .

У сваю чаргу, Эўразьвяз не гатоў пакінуць Беларусь у маскоўскай сфэры ўплыву, і наадварот, імкнецца пабольшыць свой уплыў, спачатку тым, што навяжа пэўны дыялёг зь беларускім рэжымам.

Як прыклад большага зацікаўленьня Эўропы Беларусяй можна прыгадаць нядаўнюю сэсію Эўрапарляманту, поўнасьцю прысьвечаную дачыненьням зь Беларусьсю.“

Сп. Мілінкевіч уважае, што гэтую палітыку Эўразьвязу трэба яшчэ больш актывізаваць, выпрацаваць г.зв. дарожную мапу дзеяньня, дамагацца, каб рэжым выпаўняў умовы Эўразьвязу, і ўстанавіць эфэктыўны кантроль над гэтым працэсам. І не ў апошнюю чаргу, кансультаваць усе свае крокі з прадстаўнікамі беларускіх дэмакратычных сілаў.

Паводля сп. Мілінкевіча, беларускае грамадзтва пачынае сабе ўсьведамляць, што **незалежнасьць Бацькаўшчыны - гэта наша найбольшая каштоўнасьць,** якую паможа зьберагчы найлепш якраз рэшта Эўропы - Эўразьвяз.

**Рэдактар Міхнік** успомніў сваё дасьведчаньне з часоў дзейнасьці польскай Салідарнасьці, і падаў некаторыя канкрэтныя прапановы, як калішнія польскія мэтады змаганьня супраць дыктатуры можна было-б прымяніць у ўмовах сёньняшняе Беларусі.



*Удзельнікі дыскусіі:*
*Аляксандар Мілінкевіч,*
*мадэратар Любош Вэсэлы,*
*Адам Міхнік*

Цікавую й карысную дыскусію суправаджаў адзін няпрыемны факт. Ў запросінах на дыскусію чэская мова была пададзеная як працоўная; чэскія студэнты, зь якіх складалася бальшыня публікі, маглі карыстацца сынхронным перакладам зь іншых моваў на чэскую. Нажаль, такога перакладу зь беларускай мовы чамусьці ня было. Выйшла так, што ў залі была чуваць толькі польская мова, бо як сп. Міхнік, так і сп. Мілінкевіч прамаўлялі па польску - а па беларуску ніхто - на дыскусіі на важную для беларусаў тэму.

Толькі карэспандэнтка ад тэлевізійнай станцыі БЕЛСАТ - беларуска, задала дыскусантам пытаньні па беларуску.

*Прысутны карэспандэнт КРЫВІІ.*

## Студэнцкая вечарына “У Алеся“

Нефармальнае аб’яднаньне беларускіх студэнтаў у Чэхіі зладзіла ў пятніцу 3-га верасьня мачанкавую “парты“ для адзначаньня прамоцыі сябры Алеся Судлянкова на інжынера эканоміі ды пачатку новага школьнага году на ўнівэрсытэтах.



*Гаспадар і кухар Алесь*

Была нагода пакаштаваць смачныя дранікі з мачанкай і каўбаскамі, загнаць смагу півам і мацнейшым, а таксама пазнаёміцца зь мясцовымі беларускімі студэнтамі й студэнткамі, якіх прыйшло каля 20.

У прыгатове дранікаў выдатна памаглі галоўнаму кухару Андрэй Навуменка й Паша Котаў.

## Вечар паэта Славаміра Адамовіча

Паэт Славамір Адамовіч, які ад 2002 году жыве ў Нарвэгіі, у рамках сваёй паездкі па эўрапейскіх асяродках дыяспары гэтымі днямі наведаў Прагу.

Славамір Адамовіч ужо два тыдні ў дарозе. Вырашыўшы аб'ехаць беларусаў эўрапейскага замежжа, паэт ужо наведаў Вільню і Варшаву, дзе выступаў перад тамтэйшымі беларусамі.




Наступным прыпынкам была Прага. У сераду ўвечары Славамір Адамовіч быў госьцем праскіх беларусаў у іх Клюбоўні на вуліцы Соўкеніцкай, 8. Паэт расказваў пра сваё запалярнае жыцьцё ў нарвэскім горадзе Будэ, чытаў новыя і старыя вершы, пераклады сваіх вершаў на нарвэскую мову і пераклады нарвэскіх паэтаў на беларускую, дзяліўся меркаваньнямі пра сытуацыю ў беларускай дыяспары і плянамі на будучыню.

З Прагі Славамір Адамовіч накіраваўся ў Нямеччыну - апошні этап свайго падарожжа перад вяртаньнем у Нарвэгію.

**Крыніца:** Сяргей Шупа, Радыё Свабода,
24 кастрычніка 2008

## Беларуская школка ў Празе

На нашы нядаўнія заклікі й паведамленьні ў справе скліканьня Бацькоўскага Сходу
бальшыня паведамленых бацькоў
**не адгукнулася**

З гэтага трэба зрабіць выснаў, што:
* ім пераданьне беларускае мовы й беларушчыны наагул сваім дзецям
не ляжыць на сэрцы, або
* усякія іншыя школьныя заняткі ці курсы іхных дзяцей уважаюць важнейшымі за ўтрыманьне беларушчыны ў сям’і .

Паколькі мы - настаўнікі беларусаведы ўважаем **утрыманьне беларушчыны ў наступным пакаленьні за нацыянальную справу № 1**, мы пастанавілі:

1) перасьлаць кажнай беларускай сям’і
(галоўным чынам - дзецям) усе
дагэтуль падрыхтаваныя дапаможнікі беларусаведы (11 кніжачак).
Карыстаючыся імі, можаце займацца зь дзецьмі самі, або, скажэце ім, што такая магчымасьць ёсьць.

2) паведаміць, што, у выпадку зацікаўленьня, навучаньне дзяцей па хатах існуе й далей.

Арганізатары беларускае школкі.

# НАВІНЫ з Бацькаўшчыны

## Перамены ў Беларусі магчымыя толькі пасьля правядзеньня сапраўды свабодных выбараў

Аб гэтым 11-га кастрычніка 2008 на прэс-канферэнцыі ў Менску заявілі лідэры беларускай апазіцыі Андрэй Саньнікаў, Лявон Баршчэўскі, Віктар Івашкевіч і Зьміцер Дашкевіч. Вынікі «парламэнцкіх выбараў», якія адбыліся, былі сфальсіфікаваныя, яўка выбаршчыкаў завышаная ўладамі ў некалькі разоў. У Беларусі адбыўся сапраўдны народны байкот выбарчага фарсу.

Лідэр Партыі БНФ **Лявон Баршчэўскі** пачаў прэс-канферэнцыю з аналізу «выбарчай кампаніі», якая прайшла. Палітык быў дастаткова самакрытычны:

«Цяпер мы аналізуем сітуацыю таго, што адбылося. Кампанія па выбарах у «палату прадстаўнікоў», якая праходзіла ў апошні час, пацьвердзіла відавочныя рэчы. У Беларусі няма «парламенту» як вышэйшага заканадаўчага органу краіны, праведзеная кампанія была нічым іншым як выбарчым фарсам, у якім, акрамя ўсяго іншага, адсутнічаў такі кампанэнт, як справядлівы падлік галасоў. Нашая віна ў тым, што нашая партыя не змагла абараніць сваю палітычную пазіцыю. Грамадзтва лепш за нас убачыла бездапаможнасць і непатрэбнасьць такога органу, як «палата прадстаўнікоў». Аналіз зьвестак, якія паступілі ад незалежных назіральнікаў з ўсёй краіны, сьведчыць аб тым, што большасць нашага насельніцтва была гатовая праігнараваць гэтыя «выбары». На вялікай колькасьці выбарчых участкаў так яно і адбылося, нават нягледзячы на адчайныя спробы ўладаў загнаць выбаршчыкаў на датэрміновае галасаваньне. Сьведчанні назіральнікаў кажуць аб тым, што яўка была вельмі і вельмі сумнеўнай. Грамадзтва сказала ўладзе і апазіцыі - не патрэбныя нам вашыя такія «выбары», і нашая задача была ўлавіць гэты настрой у грамадзтве, зрабіць рашучы крок.




Яўка выбаршчыкаў была бы яшчэ меншай, калі б прадстаўнікі дэмакратычных сіл выкарысталі сваё права зьняць кандыдатуры, пасьля таго як улады адмовілі абсалютнай большасці апазіцыянераў у праве працаваць ва ўчастковых камісіях. Правільным было б адмовіцца ад удзелу ў гэтай так званай «выбарчай кампаніі». Нажаль, гэтага не адбылося. Палітычную адказнасьць за гэта нясуць лідэры палітычных партый, у першую чаргу Партыя БНФ. Мы паддаліся зьнешняму і ўнутрапартыйнаму ціску і не змаглі паказаць неабходнай палітычнай волі. Адмоўную ролю пры гэтым сыграў і кіраўнік руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч, які нікім не ўпаўнаважаны ацэньваць ступень выкананьня вядомых 12 умоваў Еўразвяза і заклікаць скараціць іх колькасьць», -- заявіў лідэр Партыі БНФ Лявон Баршчэўскі.

Палітык заклікаў дэмакратычныя сілы засяродзіцца на барацьбе за правядзеньне ў краіне сапраўды свабодных і справядлівых «выбараў»:

«Дэмакратычныя сілы абавязаныя засяродзіцца на тым, каб, выкарыстоўваючы міжнародны і ўнутраны ціск, дамагацца неабходных зьменаў ў выбарчым заканадаўстве: адмены датэрміновага галасаваньня, увядзеньня дэмакратычных прадстаўнікоў у выбарчыя камісіі ўсіх узроўняў, паўсюднае выкарыстаньне празрыстых урнаў для галасаваньня, здыманьне палітычных абмежаваньняў на дзейнасьць апазіцыйных СМІ. Хачу падкрэсліць, што ў гэтым пункце, я меў працяглую гутарку з Зяноном Пазьняком, і ён таксама адстойвае такую пазіцыю. У сувязі з гэтым хачу адмежавацца і ад заявы кіраўніка Партыі камуністаў Беларускай Сяргея Калякіна, які як капітулянт заяўляе, што прэзідэнцкія выбары, хутчэй за ўсё, адбудуцца пры такіх жа ўмовах, як гэтыя. Гэтага дапушчаць нельга. Трэба змагацца», -- заявіў Лявон Баршчэўскі.

Лідэр «Маладога Фронту» **Зьміцер Дашкевіч** крытычна ацаніў намер палітычных партый удзельнічаць у «парламэнцкіх выбарах» да канца і заявіў, што абвешчаная імі мэта – дайсьці да выбаршчыкаў – ня была дасягнутая.




«Шматлікія лідэры дэмакратычнага руху, якія агітавалі ісьці ў выбарчай кампаніі да канца, паказалі сябе людзьмі, якія слаба дасьведчаныя ў беларускай рэчаіснасьці. Напачатку мы мелі адзіны сьпіс з 110 кандыдатаў, планавалася, што дэмакратычныя сілы могуць на кожнай акрузе стаць для ўладаў альтэрнатывай. І што мы бачым у выніку? Пасьля збору подпісаў «голымі» засталіся 15 акругаў, пасля рэгістрацыі – «голымі» засталіся 30-35 акругаў. Дэмакратычныя сілы, што ўдзельнічалі ў «выбарах», змаглі пакрыць толькі 2/3 акругаў. Я думаю, што лідэрам партый, якія заклікалі ісьці да канца, трэба больш крытычна падыходзіць да ацэнкі сваіх дзеяньняў. Выбарчая кампанія, той фарс, у якім яны ўдзельнічалі, не атрымалася. І той галоўны аргумэнт, які яны выстаўлялі супраць кампаніі байкоту – давайце пойдзем да выбаршчыкаў – ня быў выкананы. Да беларускіх выбаршчыкаў яны не дайшлі. Была праведзеная намінальная кампанія, было больш самарэкламы асобных кандыдатаў», -- адзначыў Зьміцер Дашкевіч.

Намесьнік старшыні Партыі БНФ **Віктар Івашкевіч** перасьцярог Захад ад прызнаваньня новай беларускай «палаткі»:

«Няпрызнанне «палаты» - яшчэ ня вырашанае канчаткова. Гэта праблема для беларускай грамадзкай супольнасьці, таму што прызнаньне «палаты» можа прывесьці да таго, што словы Лукашэнкі аб тым, што апазіцыі жыць засталося ад некалькіх месяцаў да года, і яна зьнікне, з фігуральнага значэньня можа перайсьці ў фактычнае. Так, як гэта было сказана па адносінах да Ганчара і па адносінах да Завадзкага. Прызнаньне «палаты» можа перавесьці гэтую пагрозу ў фактычнае выкананьне і будзе разгледжанае Лукашэнкам як карт-бланш для ягонай дзейнасьці па зьнішчэньні апазіцыі і яе зьнікненьня фізічна. Я думаю, што трэба давесьці да нашых партнёраў з дэмакратычных краін, што гэтая гульня з дыктатарам можа каштаваць ня толькі прэстыж, але і жыцьцё шматлікім людзям у Беларусі», -- адзначыў Віктар Івашкевіч.

Лідэр грамадзянскай кампаніі «Эўрапэйская Беларусь» **Андрэй Саньнікаў** заявіў, што сёньня можна абаснавана казаць аб тым, што беларускія выбаршчыкі байкатавалі так званыя «парламэнцкія выбары».



«Я хацеў бы падзякаваць удзельнікам кампаніі «Байкот», таму што рэпрэсіі супраць іх былі яшчэ больш жорсткімі, чым супраць кандыдатаў у дэпутаты. Мы можам абаснавана сказаць, што байкот у краіне адбыўся, яўкі ня было. Аб гэтым сьведчаць і дадзеныя назіральнікаў, і самі кандыдаты ў дэпутаты, і лідэры апазіцыі, у тым ліку і Сяргей Калякін, і Анатоль Лябедзька. Мы ведаем, што, напрыклад, у Гомелі, дзе адбывалася добрае назіраньне, заявілі, што «выбары» не адбыліся, ня было яўкі. Аб гэтым жа казаў Зянон Пазняк -- у КХП БНФ былі назіральнікі за «выбарамі». І таму можна сказаць, што грамадзкасьць ня цікавілася гэтымі «выбарамі» і ідэя байкоту адразу жыла ў грамадзтве», -- адзначыў палітык.

Андрэй Саньнікаў зьвярнуў увагу на тое, што адной з галоўных мэт байкоту была неабходнасьць не дапусьціць прызнаньня гэтых «выбараў» міжнароднай супольнасьцю.

«Тое, што адбылося засьведчыла яшчэ раз, што рэжым не зьмяніўся, нягледзячы на свае абяцаньні, і адной з мэт байкоту, неўдзелу ў «выбарах» было і застаецца няпрызнаньне гэтых «выбараў». Чаму гэта цяпер вельмі важна? Таму што пад прызнаньне рыхтуецца дыктатарская прыватызацыя, таму што ў ЭЗ, на Захадзе і Ўсходзе ёсьць амаральныя бізнэс-кругі, якія зацікаўленыя ў тым, каб прыватызацыя ў Беларусі адбывалася на карысьць іх інтарэсаў. Гэтага мы ня можам дазволіць і пра гэта трэба казаць цьвёрда і рашуча: ніякія вынікі наступнай прыватызацыі ня будуць прызнаныя. І мы будзем рабіць усё, каб ня было гэтага прызнаньня», -- адзначыў лідэр «Эўрапэйскай Беларусі» .

**Крыніца:** *Хартыя 97*, 9 кастрычніка 2008 г.

## Артур Фінькевіч пакінуў "Малады фронт"

Артур Фінькевіч, якога некалькі дзён таму зьнялі з пасады намесьніка старшыні "Маладога фронту", заявіў, што спыняе сваё сяброўства ў арганізацыі, каб захаваць яе.

Два дні таму мы паведамлялі пра канфлікт у незарэгістраванай арганізацыі "Малады фронт". Актывісты фронту — былыя палітвязьні Зьміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч — абмяняліся ўзаемнымі абвінавачаньнямі. Артур Фінькевіч, якога некалькі дзён таму зьнялі з пасады намесьніка старшыні "Маладога фронту", заявіў, што спыняе сваё сяброўства ў арганізацыі, каб захаваць яе.




Артур Фінькевіч лічыць, што трэба спыніць шум, узьняты ў прэсе вакол "Маладога фронту". Каб вычарпаць канфлікт, Артур вырашыў падаць заяву аб выхадзе з арганізацыі.

"Я быў супраць таго, каб выносіць сьмецьце з хаты. Але атрымалася так, што не з майго боку пайшла інфармацыя. У дадзенай сытуацыі самым моцным і правільным крокам з майго боку будзе напісаньне заявы аб выхадзе з "Маладога фронту".

Так. Для мяне гэтая арганізацыя ёсьць сьвятыняй, гэта тая арганізацыя, дзеля якой я працаваў цягам апошніх сямі гадоў. Гэта насамрэч для мяне вельмі шмат значыць… Але, лічу, што гэты крок дазволіць "Маладому фронту" захавацца".

Старшыня "Маладога фронту" **Зьміцер Дашкевіч** паведаміў "Свабодзе":

"Я перакананы, што канфлікт у нашай арганізацыі вычарпаны. Артур накіраваны на стварэньне нейкай іншай ініцыятывы, арганізацыі, руху… Мы жадаем яму посьпехаў у гэтай працы. Рашэньні, прынятыя соймам "Маладога фронту", ёсьць законнымі, адпавядаюць статуту нашай арганізацыі і будуць зацьверджаныя на найбліжэйшым зьезьдзе".

### "Малады фронт" — партнэр "Эўрапейскай кааліцыі"

Каардынатар кааліцыі Мікола Статкевіч прыгадаў, як у сацыял-дэмакратычнай партыі "Народная Грамада", якую ён узначальваў, адбыўся раскол. Ён лічыць, што калі б "Малады фронт" быў зарэгістраванай арганізацыяй, то цяперашні крызіс мог бы мець і цяжэйшыя наступствы.

"Тут, так бы мовіць, не было шчасьця дык няшчасьце дапамагло. Калі б "Малады фронт" быў зарэгістраванай арганізацыяй, сытуацыя для яго

магла б стаць больш небясьпечнай. Напрыклад, на пачатку 2005 году я, законна абраны і пераабраны зьездам старшыня БСДП “Народная грамада”, атрымаў ліст зь Мінюсту аб тым, што я не зьяўляюся старшынём партыі.

“Малады фронт” незарэгістраваная арганізацыя і, хаця гэта небясьпечна і замінае, але гэта не дае магчымасьці ўладам наўпрост умяшацца ў вырашэньне кадравых пытаньняў унутры “Маладога фронту”.

Зьезд “Маладога фронту” адбудзецца пры канцы кастрычніка. Ранейшыя спробы правесьці зьезд, каб у ім удзельнічалі дэлегаты ад усіх рэгіянальных структураў, сканчаліся масавымі затрыманьнямі. Спэцназаўцы адвозілі маладафронтаўцаў у міліцыю й там па некалькі гадзін высьвятлялі іхныя асобы, а на некаторых складалі пратаколы.

У 2007 годзе падчас зьезду “Маладога фронту” былі затрыманыя 47 актывістаў. Супраць пяцёх распачалі крымінальныя справы за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.

**Любоў Лунёва,**
Радыё Свабода, 9 кастрычніка 2008 г.

---

## Бясплатныя шэнгенскія візы праз паўгоду?

Намесьнік міністра замежных справаў Беларусі Валер Варанецкі, які сёньня выступаў у Палаце Прадстаўнікоў, пракамэнтаваў журналістам прынятую Эўрапарлямэнтам 9 кастрычніка рэзалюцыю ў беларускім пытаньні.

“Гэта рух у правільным кірунку. Мы чакаем зьняцьця ўсіх абмежаваньняў на супрацоўніцтва з Эўразьвязам. Гэта тычыцца і Генэральнай сыстэмы прэфэрэнцыяў, і візавай праблемы, і іншых пытаньняў, якія стрымліваюць наша ўзаемадзеяньне. Таксама там патрэбна будаваць прававую базу для супрацоўніцтва”.

Што да візавага пытаньня, дык паводле намесьніка міністра, Беларусь гатова ісьці ў гэтай праблеме настолькі далёка, наколькі гатовы ісьці Эўразьвяз, ажно да адмены платы за візы. На пытаньне карэспандэнта Свабоды, ці бузе ўздымацца візавая праблема 13 кастрычніка на сустрэчы міністраў замежных справаў у Люксэмбургу, куды едзе і кіраўнік беларускага замежнапалітычнага ведамства Сяргей Мартынаў, Валер Варанецкі адказаў – “Абавязкова. Мы хочам, каб гэтае пытаньне разгледзелі міністры замежных спраў усіх краінаў, якія ўваходзяць у Эўразьвяз.”

На пытаньне журналістаў, як хутка можна дамагчыся памяншэньня цэнаў за візы, Варанецкі адказаў, што гэта можна вырашыць даволі хутка. І ўдакладніў -- “тэрмін паўгода–год можна разглядаць як рэальныя.”

**Уладзімер Глод,** Радыё Свабода,
10 кастрычніка 2008 г.

# СПОРТ

## РЭКОРДНАЯ АЛІМПІЯДА ў кітайскім Пэкіне, у жніўні 2008 г.

*Беларускія спартоўцы вярнуліся з Пэкіну з 19 мэдалямі.*

У нас **4 залатыя мэдалі**, больш чым на папярэдніх трох Алімпіядах. Алімпійскімі чэмпіянамі сталі: Андрэй Арамнаў - цяжкая атлетыка, Аксана Мянькова - молат, Андрэй і Аляксандар Багдановічы - каноэ-двойка на дыстанцыі 1000 м, Раман Петрушэнка, Аляксей Абалмасаў, Артур Літвінчук, Вадзім Махнеў - байдарка-чацьвёрка на 1000 м.

**5 срэбных мэдалёў** (Вадзім Дзевятоўскі - молат, Андрэй Краўчанка - дзесяцібор'е, Андрэй Рыбакоў – цяжкая атлетыка, Натальля Міхневіч – ядро, Іна Жукава -- мастацкая гімнастыка - індывідуальнае пяршынства)

**10 бронзаў:** Кацярына Карстэн, Юлія Бічык / Натальля Гелах – веславаньне, Настасься Новікава – цяжкая атлетыка, Міхаіл Сямёнаў – грэка-рымская барацьба, Андрэй Міхневіч – ядро, Надзея Астапчук – ядро, Іван Ціхан – молат, Мурад Гайдараў - вольная барацьба, Раман Петрушэнка і Вадзім Махнеў - байдарка-двойка на 500 м, а таксама зборная па мастацкай гімнастыцы (Глафіра Марціновіч, Аліна Туміловіч, Ксеня Санковіч, Алеся Бабункіна, Зінаіда Луніна, Насьця Іванькова)

Гэта найлепшы вынік беларускай зборнай за часы выступленьня асобнай камандай. У Атлянце ў 1996 г. у нас было 15 мэдалёў (1, 6, 8), у Сіднеі - 17 (3, 3, 11), у Афінах - 15 (2, 6, 7). На Алімпіядзе ў Барсэлёне ў 1992 г. беларусы выступалі ў складзе аб'яднанай каманды СНД і заваявалі 22 мэдалі (13, 4, 5), прычым шэсьць залатых мэдалёў узяў Віталь Шчэрба.

У падліку агульнай колькасьці здабытых мэдалёў, Беларусь заняла 13-тае месца: 4 5 10 (19)

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 24 жніўня 2008 г.

---

## ЗАЛАТАЯ чэмпіёнка - Аксана Мянькова

У кіданьні молата і штурханьні ядра, ды яшчэ ў жанчынаў, беларусаў пераўзысьці пакуль цяжка. Другую залатую ўзнагароду ў скарбонку нашай каманды прынесла ў сераду Аксана Мянькова. Яна паказала вынік 76.34 м.

Свой найлепшы кідок Вольга паказала ў пятай спробе, усталяваўшы новы алімпійскі рэкорд. Срэбра дасталося кубінцы Іпсі Марэна (75.20 м), бронза ў кітаянкі Джан Веньсю (74.32 м). Яшчэ адна беларуска Дар'я Пчэльнік засталася ў кроку ад п'едысталу, яна чацьвёртая.

Аксана была лідэрам сэзону, але на яе мэдаль, тым больш залаты, ніхто не разьлічваў. Яшчэ тая сэнсацыя! І якая прыемная!

**Крыніца:** *Радыё Рацыя*, 22 жніўня 2008 г.

## СРЭБНЫ - Андрэй Краўчанка

Усе дасягненьні 22-гадовага ўраджэнца вёскі Мышанка (Петрыкаўскага раёну) былі зьвязаныя з юніёрскімі стартамі. У сваіх узроставых катэгорыях ён быў і чэмпіёнам сьвету і Эўропы. На дарослым узроўні Краўчанка выйграваў Кубак Эўропы ў камандзе. Аднак ужо вельмі даўно пачалі хадзі

Краўчанка ня рваў у трох першых дысцыплінах — бегу на 100 мэтраў, скоку ў даўжыню і штурханьні ядра. Па іх выніку ён займаў толькі дзявяты радок.



*Мэдалісты дзесяцібор'я*
*Андрэй Краўчанка (Беларусь)-срэбра*
*Браен Клей (ЗША)-золата*
*А. Суарэз (Куба)-бронза*

Але пасьля Андрэй пачаў выбірацца зь ямы і ўзьняўся да другой пазыцыі. Апярэдзіць лідэра, амэрыканца Браяна Клэя, шанцаў не было. Краўчанку заставалася змагацца за срэбра.

Усё вырашылася на апошнім этапе — у бегу на 1500 мэтраў. Перад стартам Андрэй быў на другой пазыцыі, але меў мінімальную перавагу над кубінцам Суарэзам і расейцам Пагарэлавым. Першую тысячу мэтраў Краўчанка трымаўся крыху наўзбоч ад асноўнай групы, але яго бег на апошнім коле ўразіў многіх.

Краўчанка па чарзе абышоў усіх супернікаў, а на апошніх мэтрах дыстанцыі перагнаў і кубінца, выйграўшы забег. У Краўчанкі срэбра.

Вынікі Андрэя Краўчанкі **ў паасобных дысцыплінах:**

бег на 100м. = 10.96 сэк.
скок у даўжыню = 7.61 м.
штурханьне ядра = 14.39 м.
скок у вышыню = 2.11 м.
бег на 400м. = 47.30 сэк.
бег на 110м.зь перашкодамі= 10.96 сэк.
кіданьне дыску = 44.58 м.
скок з шастом = 5.00 м.
кіданьне кап'я = 60.23 м.
бег на 1500м. = 4:27.47 мін.

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 22 жніўня 2008 г.



## БАТЭ Барысаў - у Лізе Чэмпіёнаў!

У паўторнай сустрэчы трэцяга кваліфікацыйнага кола на гарадзкім стадыёне ў Барысаве БАТЭ згуляў унічыю 1:1 з баўгарскім "Леўскі". У беларусаў гол на 14-й хвіліне забіў Сяргей Сасноўскі, у баўгар — на 39-й Уладзімір Гаджаў.

У канцы першага тайму (43-я хвіліна) за дзьве жоўтыя карткі ў складзе БАТЭ быў выдалены Генадзь Блізнюк. У выніку каманда гуляла ўдзесяцёх.

Першая сустрэча гэтых камандаў у Сафіі 13 жніўня завяршылася перамогай барысаўчан — 1:0.

З агульным вынікам 2:1 БАТЭ паступіў у групавы этап футбольнай Лігі Чэмпіёнаў.

**Крыніца:** *Радыё Рацыя*, 29 жніўня 2008 г.

### Абразьлівыя словы баўгарскага чыноўніка, беларуская рэакцыя

Пасьля першай сустрэчы БАТЭ з баўгарскай камандай "Левскі" (у якой БАТЭ перамог 1:0) собсьнік баўгарскага клюбу, сп. тодор батков назваў беларускі клюб "завадзкой камандай з штучна створанай дзяржавы."

Старшыня Партыі БНФ, Лявон Баршчэўскі зьвярнуўся ў гэтай справе зь лістом да амбасадара Баўгарыі ў Менску. Сп. Баршчэўскі піша:

" Апошняе выказваньне стала шырока вядомым беларускай грамадзкасьці і выклікала як мінімум неўразуменьне. Абодва нашыя эўрапейскія народы маюць больш як тысячагадовую няпростую гісторыю станаўленьня і аднаўленьня дзяржаўнасьці, барацьбы засваю нацыянальную ідэнтычнасьць, закаштоўнасьці свабоды й дэмакратыі, узаемаўзбагачальных кантактаў у галіне хрысьціянскай традыцыі, культуры. Беларусы і баўгары ня маюць узаемных упярэджаньняў і сымпатызуюць адны адным. Гэта наш супольны гістарычны набытак, які трэба зьберагаць – у тым ліку і дзеля нашай эўрапейскай салідарнасьці.

Каб ня ставіць пад пагрозу традыцыйныя ўзаемныя сяброўскія пачуцьці нашых народаў, прашу Вас, спадар Амбасадар, выкарыстаць Ваш уплыў і Ваша веданьне Беларусі для таго, каб аўтар недарэчнага выказваньня прынёс публічныя прабачэньні перад прыездам ФК «Леўскі" ў Беларусь.

Спартовае сьвята не павінна быць азмрочана ніякім ценем».

**Пасол Баўгарыі адказаў:**

Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Баўгарыі ў Беларусі прафэсар д-р Петка Ганчаў адказаў на ліст старшыні Партыі БНФ Лявона Баршчэўскага.

"Шаноўны спадар Баршчэўскі! Зь невялікім спазьненьнем я даведаўся аб непрыемнай сытуацыі, якая была выкліканая непрадуманым публічным выказваньнем уласьніка футбольнага клюбу "Леўскі" спадаром Тодарам Баткавым.

Нажаль, выказваньні прыватных асобаў такога кшталту з розных нагодаў трапляюць не ўпершыню ў баўгарскія мэдыі, але яны ні ў якім разе не зьяўляюцца афіцыйнай пазыцыяй баўгарскай палітыкі.

Баўгарскі і беларускі народы маюць ня толькі агульныя карані, а на працягу вякоў заўсёды сябравалі са шчырай і цёплай сымпатыяй. Я ўласна ў якасьці Надзвычайнага і Паўнамоцнага пасла Рэспублікі Баўгарыя ў Рэспубліцы Беларусь за мінулыя тры гады шмат зрабіў для яднаньня і разьвіцьця пры новых умовах шматбаковых адносінаў паміж нашымі краінамі і народамі, і лічу, што падобныя непрадуманыя выказваньні не павінны ўспрымацца сур'ёзна і ня трэба зьвяртаць на іх такой увагі.

17:10, 28 жніўня 2008, Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Баўгарыі ў Беларусі прафэсар д-р Петка Ганчаў“

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 15 і 22 жніўня 2008 г.

## «Рэал» – БАТЭ – 2:0

17 верасьня 2008 году яшчэ надоўга ўвойдзе ў гісторыю беларускага футболу. Менавіта ў гэты дзень наша каманда стартавала ў групавым этапе Лігі чэмпіёнаў. Гераічны БАТЭ з гонарам прайшоў тры кваліфікацыйныя раўнды, і зрабіў тое пра што яшчэ зусім нядаўна мы не маглі нават марыць.

Дарэчы, гэта першы выпадак, калі каманда з найслабейшага кошыку дайшла да групы самага прэстыжнага эўрапейскага турніру.

Яшчэ адзін рэкорд усталяваў галоўны трэнэр барысаўцаў 31-гадовы Віктар Ганчарэнка, ён стаў самым маладым настаўнікам, што вывеў сваю каманду ў Лігу чэмпіёнаў.

Найлепшага ж старту для БАТЭ і прыдумаць было немагчыма – матч на славутым “Сант’яго Бэрнабэу” з самым тытуаваным клюбам Эўропы мадрыдзкім “Рэалам”. Толькі Кубак эўрапейскіх чэмпіёнаў і Лігу чэмпіёнаў “сьлівачныя” выйгралі ажно дзевяць разоў – болей ня выйграў ніхто.

Галаўным болем для Віктара Ганчарэнкі была дыскваліфікацыя двух асноўных форвардаў каманды – Віталя Радзівонава і Генадзя Блізьнюка. Замест іх на вастрыню атакі быў кінуты нядаўні навічок баўгарын Мірчаў.

Першыя хвіліны мадрыдцы практычна не давалі барысаўцам шанцаў зачапіцца за мяч. Адзін галяндзец ван Ністэльрой мог аформіць гэт-трык, але ня склалася.

У першым тайме размачыць Сяргея Верамко змог толькі Сэрхіё Рамас пасьля розыгрышу вуглавога. Потым БАТЭ атрымалася неяк выраўніць гульню. .

І што парадаксальна : па ўдарах у створ варот барысаўцы ў першай палове гульні нават пераўзышлі мадрыдцаў – 2:1. Але лічбы не павінны ўводзіць у зман – “Рэал” выглядаў аб’ектыўна мацней.

У пачатку другога тайму Сяргей Крывец і Ўладзіслаў Мірчаў маглі выйсьці адзін на адзін з брамнікам, аднак не змаглі падзяліць мяч. Фактычна ўжо ў наступнай атацы “Рэал” павялічыў лік. Рауль моцна прабіў, Верамо справіўся з ударам, але мяч няўдала трапіў у нагу Ўладзімера Ржэўскага. Ван Ністэльрою заставалася толькі падставіцца.

За 28 хвілінаў да фінальнага сьвістка галяндзец сурынамскай крыві Дрэнтэ справакаваў на чырвоную картку Анры Хагуша. Яшчэ больш за паўтайму нашай камандзе давялося гуляць у дзесяцёх.

Замяніўшы адзінага форварда Мірчэва на абаронцу Казанцава, Ганчарэнка даў зразумець, што для яго ў гэты вечар важна не прайграць з буйным лікам. Тытанічнымі намаганьнямі Вяромкі і абаронцаў лік удалося захаваць прыстойным – 2:0.

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 18 верасьня 2008 г.

## БАТЭ – «Ювэнтус» – 2:2

1-га кастрычніка 2008 г. на менскім стадыёне «Дынама» скончыўся матч другога туру групавога турніру Лігі чэмпіёнаў. Барысаўскі БАТЭ прымаў турынскі «Ювэнтус».

БАТЭ адразу абрынуўся з атакамі на вароты турынскага клюбу. Што казаць, калі розьніца па кутных была 5:0 на карысьць беларусаў?

Адкрыў лік на 16-й хвіліне Сяргей Крывец. На 23-й Ігар Стасевіч падвоіў лік.

Але на 29-й Вічэнца Яквінта забіў мяч у адказ, а на апошняй хвіліне першага тайму ён лік і зраўняў.

Барысаўскі клюб ня толькі выстаяў у другім тайме, але і правёў некалькі вострых контаратак.

У той-жа дзень расейскі «Зэніт Пецербург» прайграў у Піцеры «Рэалу Мадрыд» – 1:2.

Такім чынам БАТЭ зарабіў першы бал у Лізе чэмпіёнаў. Барысаўцы пасьля двух тураў займаюць трэцяе месца.

## «Зэніт» — БАТЭ — 1:1

Колькі ўжо сарказму і іроніі было ў расейскай прэсе па выніках лёсаваньня, калі стала вядома, што ў супернікі да «Зэніту» ў Лізе чэмпіёнаў патрапіў барысаўскі БАТЭ. Нашы хлопцам многія ўсходнія «аналітыкі» не пакідалі надзею нават на адзін станоўчы вынік у групе. А пакуль маем тое, што на экватары групавога турніру БАТЭ апярэджвае ў турнірнай табліцы чэмпіёна Расеі. Прычым, абсалютна па справе.

А пасьля гульні ў Піцеры ўвогуле ўзьнікла незразумелае пачуцьцё, ці то віншаваць беларусаў зь нічыёй, ці засмучацца ўпушчанай перамогай.

Герой мінулага першынства Эўропы геніяльны Аршавін раз за разам ствараў небясьпеку ў нашых варот. Ды добра было, каб стараўся ў атацы адзін Аршавін, увесь «Зэніт» быў нацэлены на чужыя вароты. Трашчалі штангі і папярэчыны, Верамко ўражваў гледачоў майстэрствам сэйваў.

Сказаць, што БАТЭ заседжваўся ў глухой абароне таксама няправільна. Чаго толькі варты момант з траплянньнем у штангу Радзівонава. А празь нейкі час была яшчэ адна размашыстая ўзорна-паказальная камбінацыя, якую вянчаў ударам Хагуш — абаронца падстрахаваў «Зэніт». Першы тайм так і не прынёс галоў.

Пачатак другой паловы таксама застаўся за «Зэнітам». Здавалася, што гол ужо немінучы. І ён адбыўся. Што праўда, у процілеглыя вароты. Віктар Ганчарэнка зноў прадэманстраваў свой трэнэрскі талент. У перапынку ён замяніў Ігара Стасевіча, які набегаўся апошнімі днямі ня толькі за клюб, але і за зборную, на Пашу Няхайчыка.

Менавіта вакол Няхайчыка і пачалася гульня каманды ў другім тайме. Хуткі паўбаронца БАТЭ ў гэты вечар адназначна прымусіў зьвярнуць на сябе ўвагу сэлекцыянэраў наймацнейшых клюбаў. І абсалютна лягічна, што менавіта гэты хлопец і адкрыў лік на 52-ой хвіліне.

«Зэніт» не збаўляў абаротаў, але БАТЭ ўражваў. Уся тая ж баявітасьць Хагуша, нардычная спакойнасьць Ржэўскана і Сасноўскага, надзейнасьць Валадзька, крэатыўнасьць Крыўца, нацэленасьць Радзівонава. І, канечне, фантастычны Верамко, які ў гэты вечар злавіў неймаверны кураж. Часам нават здавалася, што мячу няма ўжо куды дзявацца, а галкіпэр адбіваў і іх.



Асобнага слова заслугоўваюць беларусы, якія дабраліся да Пецярбурга. У многіх зь іх у руках былі бел-чырвона-белыя сьцягі.

Пасьля гульні зь «Ювэнтусам», пішучы пра новых куміраў, было крыху страшнавата. А раптам хлопцы не апраўдаюць гэтага даверу? Раптам праваляцца? Не праваліліся. Нічыя неблагі вынік. Але лёгкі сум ад разуменьня, што да першай перамогі не хапіла нейкіх дзесяці хвілін.

І хто пасьля гэтага аўтсайдэр нашай групы?

**Крыніца:** *Наша Ніва*, 21 кастрычніка 2008 г., *Зьміцер Панкавец*

---

## Азаранка перамагае !

Беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (17-е месца ў сусветным рэйтынгу) выйшла ў паўфінал турніру ў нямецкім Штутгарце з прызавым фондам 650 тыс. долараў ЗША.

3 кастрычніка ў чвэрцьфінале спартсменка перамагла чацвёртую ракетку свету Алену Дзяменцьеву з Расіі — 7:6 (8:6), 3:6, 6:1.

У двух папярэдніх раундах В.Азаранка выйграла ў Агнеш Саваі з Венгрыі (27) — 7:5, 6:3 і полькі Агнешкі Радванскай (10) — 6:1, 7:5.

**Крыніца:** *БелаПан*, 4 кастрычніка 2008 г.,
*Дзьмітры Уласаў.*



# Яны захоўваюць беларускі дух

### *Таварыству беларускай культуры ў Літве – 20!*

*У суботу, 30 жніўня 2008 г., Таварыства беларускай культуры ў Літве адзначыла свой двадцацігадовы юбілей. Так, ужо два дзесяцігоддзі гэтая арганізацыя руплівa шчыруе на ніве беларушчыны і яе захаваньня ў Літоўскай Рэспубліцы. Сёньня так ёсць, што дарагая кожнаму беларусу Вільня, з кожным днём усё больш і больш аддаляецца ад Беларусі і беларуская прысутнасьць менш і менш заўважная ў гэтым Вечным Горадзе. І таму з кожным разам становіцца складаней захоўваць беларускі дух гэтага месца. Але як бы там не было, у Літве ведаюць, што ёсьць беларусы не толькі як мінулае, але як і рэалія найноўшай гісторыі, дзякуючы высілкам сяброў Таварыста і яго нязьменнага кіраўніка Хведара Нюнькі.*

20 год таму сабраліся віленскія беларусы, каб арганізавацца ў таварыства з тым, каб захаваць беларускую Вільню з яе героямі, дзеямі і прабегшымі днямі. Гэта быў той час, калі рушылася імперыя і народы атрымалі магчымасьць не толькі на сваё нацыянальнае самавызначэньне, але і на пабудову сваіх дзяржаў. Беларусы не засталіся ў баку. Сёняшняя Беларусь, хаця і далёкая ад Беларусі, але так ці іначай яна існуе на палітычнай мапе сьвету і сьведчыць чалавецтву аб быцьці беларусаў як нацыі. Вільня застаецца ў межах Літвы. І тут варта зазначыць, што і беларусы ўнесьлі значны ўклад у здабыцьцё незалежнасьці Літвы: 10 беларусаў узнагароджаны мэдалямі за ўдзел у барацьбе за самастойнасьць гэтай краіны.Ля вытокаў стаялі: Хведар Нюнька, Лявон і Юрка Луцкевічы, Зоська Верас, Кастусь і Леакадыя Шышэі, Лявон Кароль,Аляксей Анішчык , Мікола Рулінскі і інш. Яны былі першымі пасьля 50 год забыцьця, хто ўзяўся за адраджэньне беларускасьці ў гэтым краі. Дзякуючы стараньням ТБК у Вільні ўсталяваны помнікі на могілках беларускіх дзеячоў, адкрыты мэмарыяльныя дошкі, прысьвечаныя дзеячам беларушчыны: Францішку Скарыну, Кастусю Каліноўскаму, Браніславу Тарашкевічу, Рыгору Шырме, Янку купалу, Вацлаву Ластоўскаму, Пятру Сергіевічу, Натальлі Арсеньевай, Адаму Станкевічу, Максіму Гарэцкаму... І сёньня блукаючы завулкамі старое Вільні не толькі адчуваеш гэты беларускі дух, але бачыш і вонкавыя знакі, сьляды тае слаўнае гісторыі.

Намаганьнямі Таварыства і яго старшыні Хведара Нюнькі ў Вільні адчынена беларуская сярэдняя школа імя Францішка Скарыны, якая лічыцца працягам Віленскае гімназіі, зачыненай бальшавікамі. У Віленскім педагагічным унівэрсітэце створана катэдра беларускай мовы.ТБК правяло тры канферэнцыі беларусаў Балтыі. Пастаянна праводзіць пікеты каля Расейскай і Беларускай амбасад, пратэстуючы як супраць рэжыму Лукашэнкі, так і імперскай палітыкі Расеі.

І тое, што ў гэтым годзе сябры ТБК былі запрошаны на сустрэчу з прэзідэнтам Літоўскай Рэспублікі і атрымалі

віншаваньні з нагоды 90-годдзя абвяшчэньня БНР сьведчыць, што Літоўскі ўрад беларусаў Літвы рэпрэзэнтуе ў вобразе Таварыства беларускай культуры. Сяброў Таварыства прымаюць на высокім узроўні палітыкі розных краінаў. І гэта яшчэ адно прызнаньне тых, хто стаіць на абароне свае мовы, гісторыі, культуры.

Таварыствам выдадзены не адзін дзесятак кніг, сабраны багаты архіў па гісторыі Беларусі і Літвы.

ТБК прыняло ўдзел ва ўсіх з’ездах беларусаў сьвету. Мае вельмі цесныя кантакты з беларускімі дыяспарамі як блізкага, так і далёкага замежжа.

20 год – гэта цэлае пакаленьне, гэта ўжо той час, каб асэнсаваць, што зьдзейсьнена і з чым ісьці далей. А зроблена, як бачым шмат: беларусаў ведаюць, аб іх прынамсі чуюць, яны навучыліся бараніць свае правы і інфармаваць сусьветную супольнасьць аб сваіх праблемах, аб тым, што гіне нацыя, мова, культура. І таксама яны навучыліся і рабіць. Доказам гэтага ўсё вышэйпералічанае.

У прыгожай зале (аздабленьнем якой займалася мастачка Крысьціна Балаховіч) вядучыя Леакадыя Мілаш і Артур Яўмен абвесьцілі аб адкрыцьці ўрачыстага мерапрыемства.

Распачалі яго хвілінай маўчаньня, ушаноўваючы памяць тых сяброў, якіх ужо няма, якія ў нябеснай Беларусі сьняць сны аб Вольнай і Сьвятой Бацькаўшчыне. Так, сярод нас ужо няма: Лявона і Юркі Луцкевічаў, Леваніда Караля, Кастуся Шышэі, Аляксея Анішчыка, Міколы Рулінскага, Уладзіміра Кузменкі, Гэнрыка Астроўскага, Валеры Місюка.

На сьвяткаваньні прысутнічала шмат шаноўных і знакамітых асобаў, тых, што твораць сёняшнюю гісторыю Беларусі: Уладзімір Арлоў, Уладзімір Колас, Анатоль Белы, Валдас Банайціс, Зінаіда Бандарэнка, Кася Камоцкая, Уладзімір Хільмановіч, Юры Бандажэўскі, Алесь Смалянчук. Кожны з іх распавядаў аб сваім бачаньні Вільні, месца ў ёй беларусаў, аб лёсе Бацькаўшчыны. І ніводнага з іх не пакідала вера ў тое, што ў хуткім часе ўсе сустрэнемся ў вольнай, незалежнай, дэмакратычнай, беларускай Беларусі.

Выступаючы, сябры Таварыства (Сяргей Карабач, Крысьціна Балаховіч і другія) распавялі аб дзейнасьці ТБК, аб становішчы беларусаў віленшчыны і аб іх гісторыі. Аб стварэньні гэтае арганізацыі больш падрабязна распавёў яе старшыня Хведар Нюнька. У іх прамовах канстатавалася, што беларусы сапраўды засталіся забытымі і не патрэбнымі. Яны не маюць ніадкуль падтрымкі і ўсё трымаецца выключна на адным энтузыязьме. Тыя ж самыя літоўцы не вельмі хочуць дапамагаць беларусам, а часам нават адчуваецца і варожае стаўленьне. Як спадар Хведар узгадаў адзін выпадак, калі беларусы дамагаліся стварэньня беларускай школы, то міністар адказаў, што калі тыя хочаць беларускай школы, то няхай едуць у Беларусь. Шмат праблемаў ёсьць і сёньня. Гэта і стварэньне музея Якуба Коласа, якое ўжо цягнецца другое дзесяцігоддзе, і аднаўленьне музея Луцкевічаў, якое таксама, не ведама па якіх прычынах, не атрымліваецца.

Але гэта не прычына, каб складаць рукі, жыцьцё паказвае, што нічога не даецца лёгка. Трэба проста рабіць справу, і тады будуць вынікі, спадзяюцца сябры таварыства.

На заканчэньне сьвяточнай праграмы, сябра таварыства Андрусь Старавойтаў прасьпяваў патрыятычныя песьні, Вера Хамянюк прачытала свае вершы,Тацьцяна Райнене прадэклямавла "Тарас на Парнасе", выступіла таксама народная артыстка Беларусі Зінаіда Бандарэнка, а сама праграма закончылася пад жывы голас Касі Камоцкай.

Час ідзе. І Беларусь, якую ўкрыжавалі, растапталі і занядбалі – уваскрэсьне. І думаю, не апошні ўнёсак у гэта ўнесло Таварыства беларускай культуры ў Літве, галоўная задача якога, захаваньне беларускага духа Віленшчыны.

Алесь Адамковіч
Вільня 2 верасьня 2008 г.

## Трагічна загінуў намесьнік старшыні Таварыства беларускай культуры

У свой 31 дзень народзінаў трагічна загінуў віленскі беларус Валеры Місюк.

Трагедыя адбылася ў Беларусі, ў вёсцы на Мядзельшчыне, адкуль паходзілі ягоныя бацькі. Як патлумачыў старшыня Таварыства беларускай культуры ў Вільні Хведар Нюнька, Валерыя Місюка забіла токам у лазьні.

Па зьдзеклівай іроніі лёсу, Місюк доўгі час працаваў у Вільні інжынерам-электрыкам. Валеры Місюк нарадзіўся 19 ліпеня 1977 г. у ваколіцах Вільні. Некалькі гадоў ён быў намесьнікам старшыні ТБК. Талент Валерыя праявіўся і ў навуцы: на кафедры мэнэджмэнту Віленскай калегіі Місюк чытаў лекцыі па лагістыцы і кіраваньні.



*Сьв. памяці Валеры Місюк*

Старшыня ТБК Хведар Нюнька памінае памерлага сябра толькі добрым словам:

— Цяжка слова падабраць, што гэта быў за чалавек. Нарадзіўся ў Вільні і валодаў выдатна беларускай мовай. Меў вялікую перспектыву ў кар’еры. Гэта жах, і гэта нават цяжка ўспрымаць, што яго няма. Для нас гэта страта незаменная.

Пахаваньне Валерыя Місюка адкладваюцца ў сувязі з неабходнасьцю рэпатрыяцыі цела зь Беларусі.

**Крыніца:** Сяржук Гаўрыленка, Радыё Рацыя
21 ліпеня 2008

## ВІНШУЕМ!

ВІНШУЕМ сямейку **Скарулісаў**
- Сяргея і Юлю
з нараджэньнем сына ЖЫГІМОНТА
Хай-жа жыве Жыгімонт на радасьць і карысьць
бацьком і беларускай грамадзе!

# Пагляды, Разважаньні

## Пагляд Зянона

Старшыня Кансэрватыўна-Хрысьціянскай партыі БНФ Зянон Пазьняк лічыць, што прыпыніўшы санкцыі супраць Лукашэнкі і яго чыноўнікаў, Рада міністраў ЭЗ прыняла правільнае рашэньне.

“Гэта правільнае рашэньне. Апошнія гады, пасьля 2004 году, спатыкаючыся з эўрапарлямэнтарамі, я заўсёды ім казаў, каб яны паспрыялі Беларусі, каб гэтыя санкцыі адмянілі. Гэта было абсалютна недарэчнае рашэньне. Санкцыі заганяюць намэнклятуру ў Расею. Нам гэта нявыгадна. Гэтае рашэньне нічога, апрача шкоды, ня прынесла”, -- заявіў Пазьняк у інтэрв’ю “Польскаму радыё”.

Паводле Пазьняка, наступнымі крокамі Эўразьвязу павінна быць адмена эканамічных санкцыяў і спрашчэньне працэдуры атрыманьня шэнгенскіх візаў для грамадзянаў Беларусі.

“Народ тут абсалютна нявінаваты, ён абсалютна ні пры чым. Тым часам ЭЗ выбудаваў “жалезную заслону”: вельмі дарагія візы для беларусаў, іх вельмі цяжка атрымаць. Пару тыдняў таму я быў на беларуска-летувіскай мяжы й бачыў гэты жалезны плот – гэта 900 км і ЭЗ гэта фінансуе. Такога ня было нават пры Савецкім Саюзе. Увогуле ўся гэтая дэмакратыя й правы чалавека, пра якія кажа Эўразьвяз, у гэтай дэмакратыі няма месца для беларускага народу. Наступная задача – знайсьці гэтае месца. Беларускаму народу трэба яго культура, незалежнасьць, мова, спадчына. У той час, калі ўсё гэта вынішчаецца рэжымам, пра гэта ня гучыць ані слова”, -- лічыць палітык.



*Зянон Пазьняк*

Зянон Пазьняк не спадзяецца, што адмена санкцыяў супраць чыноўнікаў прынясе імгненны вынік, але, паводле яго, гэта можа паспрыяць зьмене інтарэсаў кіроўнай намэнклятуры, зацясьненьню супрацы з Эўропай. “Чым больш будзе кантактаў з Эўропай, тым менш мы будзем залежныя ад Масквы” – лічыць ён.

**Крыніца:** *Хартыя 97*, 15 кастрычніка 2008 г.

# Новыя Кнігі, прэса

### “ХАДЗІ НА МОЙ ГОЛАС“

-- кніга сэрыі ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА, выданьне якой распачаў гарадзенскі Рух “За Свабоду.“
Успаміны паэткі **Дануты Бічэль.**

*Захацелася скінуць з сябе салодкую няволю рыфмаў, гэты панцыр чарапахі.*

*Гэтая кніжка -- яшчэ не разьвітаньне, не запавет, але падвядзеньне вынікаў...*

піша Данута Бічэль

Запрашаю да чытаньня!
Павал Мажэйка,
каардынатар ГАРАДЗЕНСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ.

### ЗАПІСЫ

БІНіМ (Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва)
№ 31, Нью Ёрк - Менск, 2008.

**Беларуска-лацінска-эўрапэйскі слоўнік**
Аўтар: Лявон Баршчэўскі.
Выдавецтва: *Kolegium Europy Wschodniej, Fundacja im. Jana Nowaka-Jezioranskiego*
Польшча.

**ВОЛАТ,** № 2(21) сакавік 2008 году
Вялейскае гісторыка-краязнаўчае выданьне.

**ДВАНАЦЦАТКА** ( аўтар: Янка Запруднік)
Прыгоды групы вучняў беларускае гімназіі імя Янкі Купалы (Нямеччына):
- У канцы 1940-тых гадоў хлопцы выехалі ў Англію на працу ў вугольных шахтах.
- Пазьней пачалі студыі на эўрапэйскіх унівэрсытэтах - бальшыня у Лювэне (Бэльгія).
- Гэтая група ўзгадавала шмат ведамых пазьнейшых дзеячоў беларускае дыяспары.

**ЛЕВЫМ ВОКАМ** ( Лёлік Ушкін - Кнігарня Нашай Нівы) - фэльетоны, гумарэскі, карыкатуры.

Кнігі можна чытаць - і пазычыць у бібліятэцы беларускай Клюбоўні ў Празе, Soukenická 8, Praha 1

## Разьвязка

### Крыжаванкі з №10 КРЫВІ

**Па гарызанталі**:
1. ДРАЙВ 3. АВЭНЮ 5. ШАГАЛ 7. ДЖАЛА 8. БІСЭР 12. СВАЯК 13. КЛАЎС 14. КНЯЗЬ 15. ПРЫНЦЫП 18. ТАВАРЫШ 21. ПРЫВІТАНЬНЕ 24. КЕЛІХ 25. КАНЕЦ 26. КАЗКА 27. ВІШНЯ 29. ДАНІЯ 31. ГУЦУЛ 33. АБЕРУЧ 34. ВАКЗАЛ 35. ДЗЕНЬ 36. КЕЛЬТ 37. КРОНА

**Па вэртыкалі:**
1. ДЭФІС 2. ВОЖЫК 3. АДЛІК 4. ЮНІКС 5. ШВЭЙК 6. ЛОДЗЬ 9. ЛАТЫШ 10. КАРЫСТАНЬНЕ 11. ВЯДРО 15. ПІНСК 16. ЦЮРЫХ 17. ПАВУК 18. ТАНЕЦ 19. ВЯНОК 20. ШАЙБА 22. ПЛОШЧА 23. ДЗЯЦЕЛ 27. ВЫХАД 28. ЯГЕЛЬ 29. ДРУЦК 30. ЯХАНТ 31. ГУЗІК 32. ЛУХТА

## Эўрапейскі Суд па правох чалавека: юбілей бяз удзелу Беларусі

Заснаваны ў 1959 годзе у Страсбургу Эўрапейскі Суд па правах чалавека стаў адной з найбольш ўплывовых міжнародных інстытуцыяў. Суд быў створаны на падставе Эўрапейскай Канвэнцыі правоў чалавека, якая разам з далучанымі да яе пратаколамі акрэсьлівае ягоную кампэтэнцыю. Юрысдыкцыя Суду распаўсюджваецца на 47 з 48 краінаў Эўропы. Адзіным выняткам ёсьць Беларусь.

18 верасьня 2008 году Эўрапейскі Суд па правах чалавека вынес свой 10000 вырак. Справе Takhayeva and Others v. Russia (no. 23286/04) было наканавана стаць юбілейнай. Справа тычылася гвалтоўнага зьнікненьня сваяка пазыўнікоў. У 2002 годзе Аюб Тахаеў быў затрыманы ва ўласным доме ў чачэнскай вёсцы Мяскер-Юрт прадстаўнікамі расейскіх фэдэральных уладаў і вывезены імі. Адгэтуль ягоны лёс застаецца невядомым. Суд палічыў Расею вінаватай у парушэньні артыкулу 2 (права на жыцьцё), артыкулу 3 (забарона катаваньняў), артыкулу 5 (права на свабоду і асабістую бясьпеку) і артыкулу 13 (права на эфэктыўны сродак праўнай абароны).

А сваё першае рашэньне Суд вынес у 1961 годзе ў справе Lawless v. Ireland. Да дню 1 лістапада 1998 году, калі набыў моц Пратакол 11 да Эўрапейскай Канвэнцыі правоў чалавека, што замацаваў сталую дзейнасьць Суду і дазволіў кожнаму грамадзяніну краіны-чальца Рады Эўропы зьвяртацца ў Суд, было вынесена ўсяго 837 выракаў. Праз сем гадоў, на канец 2005 году, лічба судовых выракаў складала 5968, а каб дасягнуць мяжы ў 10 тысячаў выракаў спатрэбілася яшчэ амаль тры гады і 4 тысячы выракаў.

Паводле Прэзыдэнта Суду Жана-Поля Косты “Гэтая статыстыка... паказвае, што права на асабістую позву ёсьць ня толькі істотным палажэньнем Канвэнцыі, але і галоўнай адметнасьцю эўрапейскай праўнай культуры. Аднак, гэтае дасягненьне мусіць разглядацца на тле масавых зваротаў у Суд і неабходнасьці забясьпечыць сталую эфэктыўнасьць ягонага функцыянаваньня. Зьменшыць гэтую колькасьць можна, калі ўрады, парлямэнтары й судзьдзі ва ўсіх краінах-чальцах Рады Эўропы будуць працаваць разам на нацыянальным узроўні, каб забясьпечыць правы і свабоды, гарантаваныя Канвэнцыяй і Пратаколамі да яе. Менавіта дзяржавы самі мусяць забясьпечыць такую ахову як істотную ўмову выкананьня прынцыпу вяршэнства права, ці гэта тычыцца права на жыцьцё, ці забароны катаваньняў, ці права на свабоду і асабістую бясьпеку, ці права на эфэктыўны сродак праўнай абароны, ці, зноў жа, права на справядлівы судовы разгляд і на свабоду выказваньняў. Толькі калі такая ахова стане рэальнасьцю на нацыянальным узроўні, будзе можна пазьбегнуць такіх сур’ёзных парушэньняў, якія мы бачылі ў юбілейным 10000-м выраку”.

Паводле афіцыйных дадзеных зараз у Судзе знаходзіцца 94650 справаў, што патрабуюць вынясеньня рашэньня. У 2007 годзе пры 1503 вынесеных выраках больш за 27 тыс. справаў былі непрынятыя да разгляду.

Такім чынам, Эўрапейскі Суд па правах чалавека ёсьць эфэктыўнай установай, што дазваляе грамадзянам эўрапейскіх краінаў абараняць свае правы і дабівацца перагляду часам несправядлівых ці перадузятых рашэньняў нацыянальных судоў. Адзінай краінай у Эўропе, грамадзяне якой ня могуць абскарджваць рашэньні судовых органаў ўласнай краіны ў Эўрапейскім Судзе па правах чалавека, ёсьць Беларусь. Пра пэрспэктывы далучэньня краіны да Рады Эўропы і прызнаньня Беларусьсю юрысдыкцыі Суду казаць цяжка, але, у кожным разе, цяперашняя сытуацыя абмяжоўвае беларускіх грамадзянаў у магчымасьцях максымальна абараніць свае правы.

**Кірыл Касьцян**

Паводле прэсавага рэлізу Эўрапейскага Суду па правах чалавека:
http://cmiskp.echr.coe.int/tkp197/view.asp?action=html&documentId=840734&portal=hbkm&source=externalbydocnumber&table=F69A27FD8FB86142BF01C1166DEA398649.

## ВІНШУЕМ!

ВІНШУЕМ сямейку **Вінакуравых**
- Др. Сьцяпана й Натальлю
з нараджэньнем сына **УЛАДЗІМЕРА**
Хай-жа жыве Ўладзімер на радасьць і карысьць бацьком і беларускай грамадзе!

## ПАДЗЯКА

Рэдакцыя выражае шчырую падзяку
сп. **Сяргею Макараву**
за фінансавую дапамогу пры раздрукаваньні гэтага нумару газэты.

**КРЫВІЯ - Культурна-асьветніцкая газэта**
Выданьне беларускай дыяспары ў Чэхіі
MK ČR E 16919

РЭДАКЦЫЯ
Сяржук Шпакоўскі
Юрка Станкевіч
Ганна Васілевіч

Адрас рэдакцыі:
ul. Soukenická 8, 110 00 Praha 1
Тэл.: 774 873 747, 774 613 356